

*Фота Веранікі Клімашэвіч*

ЦЁТКА
(1876—1916)

## МОЙ САД

**Стаіць мой сад пад белым цветам:
Нарцыс — стыдлівых поўны крас,
Звісае бэз ў акно букетам,
Тульпанаў куст расцвёў зараз.**

**Цвіце ляўкой, ў пуках рабіна;
Вішнёва дрэва ў малацэ;
А там парэчка, там маліна,
А там мой граб малы расце.**

**Люблю мой сад, як расцвітае,
Як салавей свой трэль вядзе,
Як цвет галінку прыгібае,
Як пчолка мёд адтуль нясе.**

**Люблю мой сад ў маёвым ранку,
Як тоне ён у расістай мгле,
Як ліпа шэпчацца пры ганку,
І як зязюлька "ку-ку" шле.**

**Люблю мой сад пад белым цветам,
Люблю, зялёным як стаіць;
Люблю, як грушы спеюць летам
І як работай ён кіпіць.**

**Люблю мой сад у позну восень.
Як плод звісае да зямлі,
Як голкі сыплюцца ад сосен,
Як залацяцца сліў лісткі.**

**Люблю мой сад у крэпку зіму,
Як у крышталах ўвесь дрыжыць,
Як дзяцел, сеўшы на галіну,
Зімову песню загудзіць.**

*1905—1906*


ВЫДАВЕЦТВА
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»




**Як кот звяроў напалохаў**

Зборнік склалі знакамітыя казкі, якія з'яўляюцца яркім узорам багатага і самабытнага беларускага фальклору.

**Серыя «Школьная хрэстаматыя». «У палескай глушы». Творы беларускіх пісьменнікаў**

Кнігу склалі хрэстаматыйныя творы класікаў беларускай літаратуры Якуба Коласа, Янкі Купалы і Максіма Гарэцкага.

КНІГІ ВЫДАВЕЦТВА «МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА» МОЖНА НАБЫЦЬ У ЛЮБОЙ З КНІГАРАНЬ ААТ «БЕЛКНІГА»
ДАВЕДАЦЦА ПРА НАЯЎНАСЦЬ КНІГ МОЖНА ПА ТЭЛЕФОНАХ: 296-70-72, 292-70-72

ЧАСОПІСЫ «ПОЛЫМЯ» Ў МІНСКУ МОЖНА НАБЫЦЬ ПА АДРАСАХ:
– КРАМА № 13, № 18, ПЛОШЧА ПЕРАМОГІ, ПАДЗЕМНЫ ПЕРАХОД;
– КРАМА «ГЛОБУС», ВУЛ. ВАЛАДАРСКАГА, 16;
– ПАВІЛЬЁН, № 79, ПР. ПЕРАМОЖЦАЎ, 5.




# ПОЛЫМЯ

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ
І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ ЧАСОПІС

07 (1161)

ЛІПЕНЬ 2026

Выдаецца
са снежня 1922 года

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь;
Грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі»;
Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Мастацкая літаратура»

Намеснік дырэктара — галоўны рэдактар
Віктар Анатольевіч ШНІП

Рэдакцыйная калегія:

Лада АЛЕЙНІК, Алесь БАДАК,
Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ, Уладзімір ГУСАКОЎ,
Марыя ЗАХАРЭВІЧ, Віктар ІЎЧАНКАЎ,
Аляксандр КАВАЛЕНЯ, Алесь КАРЛЮКЕВІЧ,
Валерый МАКСІМОВІЧ, Зоя МЕЛЬНІКАВА,
Пётр НІКІЦЕНКА, Віктар ПРАЎДЗІН,
Зіновій ПРЫГОДЗІЧ,
Уладзімір САЛАМАХА, Васіль СТАРЫЧОНАК,
Таццяна ШАМЯКІНА, Наталля ЯКАВЕНКА

Мінск
УП «Мастацкая літаратура»
2026

16+

## Паэзія і проза

**Казімір Камейша.** Люстэркі нашай памяці. *Вершы* 3
**Навум Гальпяровіч.** Мая Сцяна Плачу. *З будучай кнігі «Мой Ерусалім»* 8
**Таццяна Яцук.** Гаючая вера ў дабро. *Вершы* 31
**Уладзя Прон.** Два апавяданні 35
**Жанна Міус.** Трапяткая прага адкрыцця. *Вершы* 44
**Тамара Кручэнка.** Званок з мінулага. *Апавяданне* 48
**Вікторыя Сон.** Іду спаткацца са святлом. *Вершы* 55

## Спадчына

**Уладзімір Гніламедаў.** Рымароўка, Пруска і крыху ЗША. *Раман. Пачатак* 57
**Святлана Мажалоўская.** Родны бераг Любові Тарасюк 79
**Любоў Тарасюк.** Высокай мары — агонь высокі... *З неапублікаваных вершаў* 85

## Архівы

**Васіль Азярэц.** «Дарагі Пётр Міронавіч!» *Пісьменніцкі зварот да кіраўніка рэспублікі* 91
**Максім Кішчанка.** З сямейнага архіва: маналогі, успаміны, вершы 94

## Краязнаўства

**Алесь Карлюкевіч.** Чавускі край. Літаратурнае гняздо Беларусі 107

## Памяць

**Эмануіл Іофе.** Уклад жанчын Беларусі ў Вялікую Перамогу 119

## Культура мовы

**Аляксей Тучынскі.** Безэквівалентная лексіка як катэгорыя канцэптуалізацыі моўнай карціны свету (на матэрыяле французскай мовы) 129

## Рэдактарскія занатоўкі

**Пятро Жаўняровіч.** Як абыходзіцца са «справай»? 136

## Кнігарня

**Алена Разумоўская.** Жаночы почырк, альбо сэрцам адданая роднай зямлі 139
**Мікола Берлеж.** Паяднаны родавым карэннем 141

## Казімір Камейша

# Люстэркі нашай памяці

*Вершы*




***Камейша Казімір Вікенцьевіч*** нарадзіўся 4 снежня 1943 года ў вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна (1970). Працаваў у раённых газетах, на Беларускім радыё, у часопісах «Вясёлка», «Маладосць», «Полымя», «Вожык».

Аўтар зборнікаў паэзіі «Восеньскія позвы» (1969), «Мембрана» (1972), «Нектар» (1974), «Тут мае вёсны прычалены» (1977), «Сябрына» (1978), «Плёс» (1982), «Галоўная вярста» (1985), «Пярэймы дня» (1988), «Кубак блакіту» (1993), «Лінія лёсу» (1996) і інш, кніг прозы «Духмянае дзіва» (1984), «Паміж кубкам і вуснамі» (2010), «Ад Кромані да Свіцязі» (2013), шматлікіх кніг для дзяцей.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова, Нацыянальнай літаратурнай прэміі і прэміі «Залаты Купідон».

### Слодыч палыну

Я ўдосталь даўняй горкасці глынуў,
Усё цярпеў, дзе міла, дзе не міла.
А ў горкасці спрадвечнай палыну
Такая слодыч дзіўная здзівіла.

У росце маладым травы густой
Была адна падобна дзіўнасіле.
Былі чыесьці вусны з гаркатой,
Што слодычна душу мне апалілі.

Я ў ранні выбіў з рук яго касу,
Я ахінуў абдымкамі паўлета.
І гаркаты тваёй мядовы сум
Я атрымаў адплатаю за гэта.

Ты праз палын, мой даўні сум, брыдзеш
Халоднай і вятрыстаю вярстою.
Ахвярна я пражыў свой лепшы дзень
З салодкаю і горкай праватою.

Не кляўся сам, нікога не кляну.
Не тое штосьці творыцца, не тое.
Я не хлушу пра слодыч палыну,
Не скарджуся, што мёд мой з гаркатою.

Навум Гальпяровіч

# Мая Сцяна Плачу

*З будучай кнігі «Мой Ерусалім»*



**Гальпяровіч Навум Якаўлевіч** нарадзіўся 14 студзеня 1948 года ў Полацку. Скончыў Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава (1979). Працаваў уласным карэспандэнтам Беларускага радыё ў Віцебскай вобласці, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Вожык», намеснікам старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, галоўным рэдактарам каардынацыйнай дырэкцыі Беларускага радыё, галоўным рэдактарам замежнага вяшчання Беларускага радыё і намеснікам дырэктара канала «Культура» Беларускага радыё.

Аўтар паэтычных кніг «Брама» (1990), «Востраў душы» (1995), «Струна» (1997), «Шляхі і вяртанні» (2000), «Святло ў акне» (2002), «Голас і рэха» (2004), «На трапяткім агні» (2012), «Сюжэт для вечнасці» (2013), «Час лістападу» (2018) і інш.

Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (2021).

Сцяна Плачу ў Ерусаліме штогод прыцягвае тысячы турыстаў з усяго свету. Наведаўшы Сцяну Плачу, можна звярнуцца да Бога праз святое пасланне, і вашыя просьбы абавязкова будуць пачутыя. Сюды можна прыйсці любому чалавеку незалежна ад веры, якую ён вызнае.

— Мы выходзім на станцыі метро Бабаашань, — сказала мне Оля.

Я быў другі дзень у Пекіне, прыляцелі мы туды позна ноччу, а сёння з дачкой пайшлі пагуляць па горадзе.

— Заўтра мы сходзім на тое месца, у гонар якога носіць назву наша станцыя метро.

Ад метро мы прайшлі пешшу, павярнуўшы на вуліцу Шыньдзішаньлу, дзе і знаходзіцца месца працы маёй дачкі — Міжнароднае радыё Кітая.

Побач з чатырнаццаціпавярховым будынкам радыё стаяў гатэль, дзе Оля ўжо трэці год жыла. Мы з Марыяй прыехалі ў госці і меліся прабыць у яе дваццаць дзён.

— Дык вось, — сказала назаўтра дачка. — Бабаашань — гэта могілкі, дзе пахаваныя самыя выдатныя дзеячы Кітая.

— Могілкі? — здзівіўся я. — У цэнтры горада? Колькі ж яны месца займаюць?

— Ой, тата, ты не разумееш. Гэта такі комплекс, што займае больш за дзесяць тысяч квадратных метраў. Хочаш, мы пройдзем туды, пагуляем?

— Пагуляць на могілках?

Гэта было незвычайна. Я сказаў, што, па-мойму, у Пекіне нямала іншых цікавых мясцін.

Але Оля запэўніла, што Бабаашань таксама адна з выдатнасцяў Пекіна, бо сюды прыходзяць кожны дзень сотні людзей, што мемарыял урадам краіны прызнаны месцам патрыятычнай адукацыі.

Таццяна Яцук

# Гаючая вера ў дабро

*Вершы*



***Яцук Таццяна Мікалаеўна*** нарадзілася 19 сакавіка 1963 года ў вёсцы Радагошча Навагрудскага раёна. У 1985 скончыла філалагічны факультэт БДУ.

Аўтар зборнікаў паэзіі «Груша над абрывам» (2017), «Маладосць на выданні» (2017), «Валошкавыя сны» (2018), «Паэма блукання і веры» (2019), «Бліскавіцы над Свіцяззю» (2019), «Алфавітная музыка слоў» (2020), «За сіняй птушкай» (2020) і інш.

Цяпер працуе кіраўніком літаратурнага аб'яднання «Купальскія зоры» пры Баранавіцкай цэнтральнай бібліятэцы. Лаўрэат літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ў намінацыі «Паэзія» за зборнік «Зоркі ў прыполе» (2022).

## Музыка душы

Калі знікаюць трапныя радочкі,
Ні думак і ні вобразаў няма,
Тады блукаю воўкам-адзіночкам,
А поруч непрабудная зіма.

Калі наўкол ні вобраза, ні зыку,
Здаецца, што спустошана Зямля,
Падобны свет знямеламу музыку,
Дзе цемрыць спапялелая ралля.

Калі маўчыць зацята так натхненне,
І стыне спеў душэўны, бы мярцвяк,
Я заміраю ў шчырасці малення,
Там кружацца радочкі, як вятрак.

Калі ж, бы скрыпка, заспявае муза,
Успыхне свечкай чыстая душа
І скіне ў прорву ворах перагрузак,
То сэрца будзе сотні спраў рашаць.

І вечарніцы будуць танчыць. Дзіва
Як можа музыка гучаць душы.
Радочак самы чысты і праўдзівы
Натхнёна затрапечацца ў цішы.

ПРОЗА

## Уладзя Прон

# Два апавяданні



***Прон Уладзя (Паўловіч Уладзімір Свірыдавіч)*** нарадзіўся на Пухаўшчыне 25 жніўня 1946 года. Вышэйшую адукацыю атрымаў на фізічным факультэце БДУ (1969). Прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, член Саюза пісьменнікаў Беларусі (2025). Даследуе спадчыну Францішка Скарыны: «Літаратурна-мастацкая творчасць Францішка Скарыны. Дзеля асветы і выхавання моладзі» (2019) і інш.

Аўтар пяці манаграфій, мастацка-дакументальнага нарыса «Ігуменшчына. Вёскі Бабы, Берлеж, Блужа і наваколле» (2021), зборніка вершаў «Сцелецца ранак туманам» (2024), рамана «Хутар» (2023—2025), больш як сотні навуковых артыкулаў, якія друкаваліся ў айчынных і замежных часопісах, звыш трох соцень навуковых прац.

## Курсістка

Самалёт прызямліўся ў Краснаярску.

Вася, камандзір будаўнічага атрада, праціраючы акуляры, абдумваў, як рухацца далей. Тым часам шмат хто з байцоў атрада наведаў цеплаход, на якім у 1897 годзе Уладзімір Ільіч Ленін ехаў у высылку ў Мінусінск. Трэба ж — гістарычны факт!

Нарэшце выбар зроблены, і з Краснаярска будатрадаўцы вырашылі рухацца аўтобусам да пасёлка Вялікая Мурта. У мясцовай кнігарні Ян па мянушцы Аспірант адшукаў дзясятак кніг з серыі «Сусветная літаратура», наладаваў імі заплечнік і з такім вялізным цяжарам разам з астатнімі перабіраўся з аднаго транспарта на другі. Ранкам наступнага дня лёгкі баркас прышвартаваў да прычала ў пасёлку Матыгіна, што ў Ніжнім Прыангар'і.

Камандзір наведаў начальніка мясцовага будтрэста. Адтрымаў заданне — рамонт лазні: згніла падлога, аселі сцены, падняць і падвесці бетонны падмурак; перакрыць дах харчовага блока сталовай; закласці падмурак пад тры новыя незаселеныя жылыя домікі; па замове жыхароў рабіць рамонт у старых будынках.

— Праграма вялікая, — сказаў начальнік. — Трэба выканаць да халадоў. З вамі будзе працаваць дзядзька Ваня — шафёр «ЗІЛа» з пасёлка Кулакова. Гэта — на Тасеі. Ён беларус, душа-чалавек, з сям'і ссыльных. Будзе цягаць аўтамабілем бетонамяшалкі. Валі, Вася, на яго любыя перавозкі.

Атрад размясціўся ў занядбалым інтэрнаце — звычайным бараку, у якім узімку, верагодна, ніхто не пражываў. Перад будынкам — пятнаццаць метраў ад яго — знаходзілася мыйня з падведзенай вадой і каналізацыяй. З супрацьлеглага боку быў адхон і пачыналася тайга. Дакладней, не тайга, а тое, што пакінулі ад яе лесарубы ды тралёўшчыкі. Раны крыху загаіліся, і маладыя парасткі піхты (таннай драўніннай пароды) прабівалася паўсюдна. Акно пакоя, у

Жанна Міус

# Трапяткая прага адкрыцця

*Вершы*



***Міус Жанна (Усцінава Жанна Віктараўна)*** нарадзілася 18 студзеня 1976 года ў в. Капачы Мсціслаўскага раёна. Вучылася на філалагічным факультэце Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. Куляшова. Працавала настаўніцай і намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце ў ДУА «Гарбавіцкі Д/С — СШ» Чавускага раёна Магілёўскай вобласці.

Аўтар кніг паэзіі «Лунный чай» (2013), «Інтанацыя» (2019), «Мае Медуніды» (2019), кніг для дзяцей «Странные детки» (2018), «Первоапрельский суп» (2020) — «Нескучательная дочка» (2021), «Сиреневая Соня в Чудесонии» (2021), «На пытанне ёсць... паданне» (2022) і многіх іншых.

Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя А. Пысіна за кнігу вершаў «Інтанацыя» (2019), прэміі Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта «Дасягненне» ў намінацыі «Літаратурная дзейнасць» (2021).

## Аснова

Нічога не бывае
бясконцым:
калісьці
загіганціцца Сонца,
а потым
белым карлікам стане —
на дыване абзораным звяне...

Адкрыццяў
мудрада́йныя промні
кладуцца чалавеку
на скроні —
сівее чалавек і сталее,
а свой сыход
аспрэчыць не ўмее.

Успыхваюць
і гаснуць размовы.
Ды ў часе
ўваскрасаюць нанова!
Адчай штурхае нас
не скарыцца —
за слова,
як за вечнасць, схапіцца:

бо слова,
незгасальнае слова,
праменіла ў пачатку —
асновай...

Тамара Кручэнка

# Званок з мінулага

*Апавяданне*



***Кручэнка (Купрэвіч) Тамара Віктараўна*** нарадзілася 30 мая 1955 года ў райцэнтры Мядзел Мінскай вобласці. Скончыла філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1977г.). Звыш 40 гадоў адпрацавала журналістам у СМІ Гомельшчыны, з іх чвэрць стагоддзя — у абласной газеце «Гомельская праўда». Аўтар зборнікаў публіцыстыкі «Лёсаў зорныя імгненні» (2014 г.) і «Майскі сад» (2022 г.), паэтычных кніг «Край бацькоўскі» (200 7г.), «Прысвячэнне» (2018 г.), «Родны бераг» (2020 г.), «Мядзел, кветка мядовая» (2025 г.), сааўтар калектыўных выданняў. Лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага і шэрагу міжнародных.

*Светлай памяці журналістаў і выдаўцоў памежжа*

Галіне тэлефанавала на працу медсястра з суседняга раёна. Прадставілася Ларысай, сказала, што шукае яе, Галіну, нявестка Паўла Афанасьевіча. «Ну, вы ж, безумоўна, ведаеце, якога? — з загадкавай інтанацыяй у голасе прамовіла незнаёмка. — Я адпачывала з яго сынам і нявесткай у адным санаторыі…»

«Так-так, ведаю… — адказала Галіна сцішана, бо ў рабочым кабінеце былі іншыя супрацоўнікі. — Скажыце Віялеце, што нумар майго мабільнага не змяніўся. Чакаю яе званка».

Галіна імгненна прааналізавала абставіны, з-за якіх тэлефанавала Віялета: «Хутчэй за ўсё, Афанасьевіч зноў у бальніцы, са сваёй дэпрэсіяй… Пэўна, хоча, каб я прыехала…»

Але ж не лепшы час ехаць да суседзяў з любой нагоды. Адносіны паміж краінамі, нават суседнімі, пагаршаюцца. Вунь нядаўна знаёмы па працы ў выдавецтве Іван шчыра падзяліўся: «Сястра ў Кіеве замужам за выхадцам з заходняй часткі. Ён так яе «адукаваў», што не атрымліваецца нармальнай размовы. Уяўляеш, з роднай сястрой не магу па-чалавечы пагаманіць. Так паглыбіліся ў палітыку, папракаюць нас, беларусаў, што мы ў саюзе з Расіяй. Во, дажыліся!»

Віялецін званок вырваў Галіну са звыклых абставін надоўга. Тая гаварыла сваёй спеўнаю мовай, бо ведала: Галіна разумее, перакладчык не патрэбны. Пачала здалёк.

— Канстанцінаўна, вы ж да нас добра ставіліся. Вы ж былі ў нас неаднаразова. А як Афанасьевіч заўжды быў рады бачыць вас! Вы ж адчувалі яго асаблівы інтарэс, прычым не толькі як да спецыяліста выдавецкай справы. Ён цаніў вас як мудрую жанчыну…

— Так, дзякуй за добрыя словы ў мой адрас, Віялета. Мае адносіны да вас з Андрэем і Паўлам Афанасьевічам не змяніліся, застаюцца шчырымі, спагаднымі. Я ведаю Афанасьевіча і большасць з яго калектыву як прафесіяналаў. Думаю, што і цяпер, у такі няпросты для славян час, Павел даражыць нашым

ПАЭЗІЯ



## Вікторыя Сон

# Іду спаткацца са святлом

*Вершы*

***Сон Вікторыя (Шчучко Вікторыя Кірылаўна)*** нарадзілася 18 чэрвеня 2005 года ў горадзе Мінску. Скончыла філалагічны факультэт БДУ, аддзяленне беларускай філалогіі. Друкавалася з вершамі ў газеце «Літаратура і мастацтва», з апавяданнямі — у часопісе «Маладосць».

* * *

Іду спаткацца са святлом,
што адлюстроўваецца ў снезе,
мароз пад шалік шчыльны лезе,
пахучы кіпень п’ю нагбом.

Іду спаткацца са святлом,
прыжмурыўшы пад шапкай вочы,
гляджу, дзе птах адважны крочыў,
іду спаткацца са святлом...

* * *

Дакранайся нутра — не цялеснасці.
Пад анёльска-крыштальнымі крыламі
ты не знойдзеш жывога і месца ці
загубіш свае пад магіламі.

Пад барвова-вільготнымі ранамі
дакранайся да шкляна-жалезных
да аскепкаў. Не думай, што рана мы
загубіліся ў дахах нябесных.

Дакранайся да болю аголена,
да нутра, ад пакут тых забітага.
Ты не знойдзеш за доляй замоленай
ні крыжа ды ні шчасця разбітага...

16+

АДРАС РЭДАКЦЫІ
Юрыдычны адрас:
Рэспубліка Беларусь, 220004, Мінск, пр. Пераможцаў, 11.
e-mail: mail@mastlit.by

Паштовы адрас: Рэспубліка Беларусь, 220004, Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 902

Тэл.: галоўнага рэдактара — 203-31-12,
аддзелаў прозы, паэзіі,
крытыкі і літаратуразнаўства — 203-24-87.

e-mail: polyma@mastlit.by

Падпісныя індэксы:

00471 — індывідуальны льготны
для настаўнікаў

74985 — індывідуальны

749852 — ведамасны

00727 — ведамасны льготны
для ўстаноў Міністэрства культуры
і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 9
ад 19.07.2021, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Выдавец
Выдавецкае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Дырэктар — Аляксандр Мікалаевіч БАДАК

Рэдактары аддзелаў
*Н. М. КАЗАПАЛЯНСКАЯ, П. П. ЖАЎНЯРОВІЧ*

Тэхнічны рэдактар, камп’ютарная вёрстка, дызайн
*Н. А. АРЦЁМАВА*

Стыльрэдактар
*В. В. КРЫВАДУБСКАЯ*

*У нумары выкарыстаны малюнкі ВЕРАНІКІ КЛІМАШЭВІЧ*

Падпісана да друку 09.07.2026 г. Фармат 70×108 $^1/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Умоўн. друк. арк. 12,60. Ул.-выд. арк. 11,31. Тыраж 585 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, 220123, Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Часопіс уключаны ў Пералік навуковых выданняў ВАК Рэспублікі Беларусь
для друкавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па філалагічных навуках
(літаратуразнаўства).

Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях,
у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.
Рукапісы не рэцэнзуюцца і аб’ёмам да двух аркушаў не вяртаюцца.
У выпадках паліграфічнага браку ў часопісе звяртацца ў друкарню.

© Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, 2026
© Грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», 2026
© УП «Мастацкая літаратура», 2026